№ 55 Ausgabe B.

ГОМАН

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Цэна с перасылкай і дастаукай да хаты:
на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы — 1 м. 20 ф., на 1 мес. — 40 фэн.

Адрэс рэдакції: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрації і экспэдыціі: М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак:
на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі — 25 фэніг.; дробные абвесткі — па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам

№ 55 (251). Год III. Вільня, 16 ліпня 1918 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.)

15 ліпня.

Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага: На паўдня—заход ад Іпра непрыяцелі пасьля вялікай падгатоўкі агнём уварваліся на вузкім фронце ў ваколіцы нашых пазыцый. Пад вечар агонь пабольшаў на ўсім фронце.

Фронт нямецкага Насьледніка: Між Эн і Марн ажыўленая баевая чыннасьць. У многіх мясцох мясцовые пяхотные бітвы.

МАСКВА (В.Т.Б.). Англіцка-амэрыканскіе войскі, згодна з газэтнымі весткамі занялі ўсю паўночную часьць Мурманскай чыгункі, абнімаючы Кем, і йдуць на Сарокі. Начальнікі саюзьніцкіх войск: англіцкі адмірал Кэмп, француз дэ ля Говро і начальнік амэрыканскіх войск — разам з мясцовым саветам выпусьцілі адозву, кажучы, што яны занялі гэты абшар дзеля абароны ад немцаў і фінляндцаў. Расея цяпер — безрадна, і Мурманскае узьбярэжжэ становіць уласнасьць савецкага ўраду, але толькі пад апекай саюзьнікаў.

Паўстаньне ў Маскве закончэно. Паадзінокіе будоўлі шмат пацярпелі ад артылеры. У Яраславе палажэньне сур'ёзнае, Між Чэлябінскам і Омскам паны палажэньня — чэха-славакі. Чыгунка Вологда-Бугульма разарвана. С прычыны нестачы войск урадовые ўласьці пакінулі Уфу і перэбраліся ў Бірск.

ШТОКГОЛЬМ. У Александраўск прыбылі тры англіцкіе транспорты. высадзіўшые два палкі пяхоты, некалькі эскадронаў кавалеры і шэсьць батарэй. У Кандалажску, Кемі і Царацку саюзьнікі адкрылі рэкруцкіе канторы, якіе суляць дабравольцам па 150 руб. у месяц. Дагэтуль запісалося каля 2.000 душ.

У Архангельску ждуць Буканэна, каторому, аднак, мае быць забаронено ехаць далей на Вологду.

ХАРБІН (В.Т.Б.). Хорват перанёс свой урад у Гродэково. Ен вядзе перэгаворы с чэха-славакамі ў Нікольску. У сваей адозьве ён трэбуе аднаўленьня ўсіх умоў с саюзьнікамі, скасаваньня нацыаналізацыі і соцыалізацыі таргоўлі і прамышленасьці.

БАЗЭЛЬ. Саюзьнікі ўзялі паўвостраў Кола з яго незамерзаючымі гаванямі. Англіцкіе газэты лічуць панаваньне саюзьнікаў у Кола абезпечэным.

МАСКВА (В.Т.Б.). На месца Мурав'ёва за глаўнакамандуючага войскам, якое выступіло проці чэха-славакоў, назначэн Казайтіс, начальнік латышскай дывізіі.

ПАРЫЖ (Гавас). На заседаньні спаўніцельнага камітэту соцыал-радыкальнай партыі Керэнскій заявіў, што ён усё яшчэ лічыць Расею ў стане вайны з Нямеччынай. Керэнскій прызывае ўсе саюзные народы памагчы Расеі войскам і глаўным чынам снарадамі. Толькі гэтак Расею можна выратаваць з яе крытычнага палажэньня. Але трэба з гэтым сьпешацца, бо цераз 3 месяцы мо' ўжо будзе позна.

Увага. Керэнскій, як відаць, нічога не навучыўся і нічога не забыўся. Цяжкіе пасьледзтвы яго леташняе ваяўнічае палітыкі, выдаўшай Расею большэвіком, нічога яго не навучылі.

ВЕНА. З Расеі, як наказывае ваенны міністэр, вярнулася каля паўмільёна аўстрыяцкіх палонных.

МАСКВА (П.Т.А.). На моцы ўгоды між расеей і Фінляндыей мірные перэгаворы будуць адбывацца ў Рэвэлі. Галавой расейскай дэлегацыі будзе расейскі пасол у Швэціі, Воровскій.

ЦЮРЫХ. Між Фінляндыей і Расеей граніца зачынена, быццам дзеля заразы.

МАСКВА (В.Т.Б.). 14.VII. Даходы расейскай рэспублікі за першае паўгоду 1918 г. на 300 мільёнаў больш, як у леташнім году. Выдаткі на дэмобілізацыю арміі і т. п. даходзяць 4 мільярдаў 962 мільенаў рублёў. Леташніе расходы на гэта даходзілі блізка 23 мільярдаў руб.

БРУССЭЛЬ. Нацыанальны камітэт Валёніі ў сваей заяве трэбуе культурнага і палітычнага разьдзелу Валёніі і Фляндрыі, каторы, аднак, не павінен давясьці да зьніштажэньня бэльгійскай еднасьці. Бэльгія павінна стацца фэдэрацыйнай дзержавай.

ШТОКГОЛЬМ. На параходзе «Ingiermanland» быў прыпадак сьмерці ад халеры.

БЭРН (В.Т.Б.) Англіцкіе газэты прызнаюцца, што ўраджай у Англіі с прычыны сушы нядобры. Лёрд Рутленд прапануе ў газэце «Times», каб духавенства рабіло публічные набажэнствы аб даждж̌ы. Ен пішэ: «ужо два месяцы, як ня йшоў дождж, збожжэ сохне с кожным днём, корневые расьліны таксама сохнуць. Добры ўраджай мае быць толькі сена і бульбы.

ВАШЫНГТОН (Рэўтэр). Сэнат прыняў рэзалюцыю, даючую права прэзыдэнту ўзяць пад свой контроль тэлеграфы і тэлефоны.

КОПЭНГАГА. Між Расеей і Даніей ідуць перэгаворы аб дастаўцы Расеей у Данію лёну, каноплі і мэталаў, каторые будуць вернены ў Расею ў форме выробленых з іх тавараў.

БЭРЛІН (Гавас). Брандінг вярнуўся с французскага фронту. Ен сказаў, што здаволен бачэным.

БЭРН. Амэрыканскіе газэты высказывае сільнае нездавольства новай японскай праграмай будаваньня флоту.

БАЗЭЛЬ. За апошніе два гады ў Амэрыку зусім не даходзілі нямецкіе газэты.

Вільня, 16 ліпня 1918.

Ня гледзячы на тое, што пытаньне аб агульным павароці з Маскоўшчыны сотняў тысяч беларускіх высяленцаў усё яшчэ жджэ свае разьвязкі, людзі, адарваные вайной ад роднае старонкі памалу ў адзіночку, ці невялікімі гурткамі праходзяць праз усе кордоны і варочаюцца да сваіх вёсак, сваіх хат. Такіх людзей — немала. Прабыўшы тры гады здалёк ад Бацькаўшчыны, перэцярпеўшы ў чужыне і голад, і холад, і чужацкую паняверку, тэтые сыны Беларусі ня здолелі вытрываць даўжэй у Расеі, і с кожным днём іх прыбывае больш і больш.

Шмат хто за апошніе часы разбагацеў, разжыўся на грошы і варочаецца дамоў не с пустымі рукамі. Але тые «бумажкі», якіе вязуць сюды нашы ўцекачы цэлымі жменямі, не шмат маюць цаны. І ўзьнімаецца пытаньне: няўжож апрыч грошы, яны нічога не маюць, не прывязуць у родны Край, няўжо-ж нічога ў іх німа для душы?

Доўгая разлука с сваей Зяммёй пакінула глыбокі сьлед у душах нашых уцекачоў. Там між маскалямі, нават абмаскоўленые беларусы зразумелі, якая вялізарная розьніца дзеліць народы беларускі і маскоўскі. Там яны ў штодзенным жыцьці пазналі ўсю брахлівасьць навукі расейскай школы, якая ўбівала ў дзіцячые галовы дзікую думку, бытцым беларусы — тые-ж маскалі, бытцым Край Беларускі—гэта «ісконі русская земля», бытцым мова беларуская — толькі папсаваная маскоўская мова. Жыцьцё — найвялікшы вучыцель, і яно вучыло несьвядомых сваей нацыанальнасьці беларусаў, што Маскоўшчына — гэта для нас зусім чужы край, што народ расейскі — для нас чужы і думае зусім не аб карысьці сваіх «братоў» беларусаў, а толькі аб сваей уласнай.

Гэту навуку, якую дало ім жыцьцё, павязуць яны ў свае родные вёскі, каторые цяпер разам с сваім „простым“ народам і „простай“ мовай выдаюцца ім такімі любымі і дарагімі, як ніколі. А тут, дома, яны даведаюцца ад сваіх бацькоў, жонак і братоў, што рабіў другі „братні“ народ, палякі, каторые, забыўшыся аб слаўным некалі клічу: „за нашу і вашу волю“, у момэнт адбудовы сваей Польскай дзержавы ўсе сілы свае напружалі дзеля таго, каб паняволіць беларусаў, каб ня толькі зьнішчыць іх найдаражэйшы духовы скарб—іх нацыанальную душу, але і зрабаваць для будучых польскіх колоністаў спрадвечна беларускую зямлю, без каторай мы ня можэм нават думаць аб ясьнейшай будучыні.—Даведаюцца, як „браты“ палякі заманівалі беларускіх галодных дзяцей лыжкай гарачай стравы ў польскіе школы, дзе над гэтай безбароннай драбязой чынілі найстрашнейшы гвалт—гвалт духовы, абарачываючы іх у „палякоў“. Даведаюцца, як далася нам у знакі польская гаспадарка, дый самі дапоўняць абраз яе апаведаньнямі аб зьдзеку, грабежствах і забойствах бязвінных беларускіх селян польскімі легіонерамі генэрала Доўбора-Мусьніцкага...

А даведаўшыся — зразумеюць, што мы, беларусы, становім асобную сям'ю паміж народамі, што наш інтэрас, наша карысьць—іншые чым у нашых суседзяў, што нашу долю і нашэ шчасьце мы павінны збудаваць самі — сваімі рукамі, бо тые, што ўдавалі нашых прыяцеляў і дабрахвотнікаў, думаюць адно аб тым, каб нас паняволіць, каб высмактаць нашы сокі, каб абярнуць вольны беларускі народ у сваіх парабкоў

Нехай-жэ кожын беларус, каторы варочаецца дамоў пасьля вандроўкі па чужых краёх, нясе ў родную вёску сьвет нацыанальнай сьвядомасьці і нехай нясе туды добрую весьць, што прабіла ўжо гадзіна свабоды і для беларускага народу; нехай памагае згуртаваць беларускіе сілы дзеля беларускай культурна - нацыанальнай работы, дзеля таго, каб распыленые на вялізарным абшары беларусы ўсе, як адзін, пачулі, што яны— адзін народ, адна сем'я, і далі востры адпор нашым ворагам, якіе цікуюць на нашы душы і на аснову нашага матэр'яльнага быту —нашу зямлю.

З Расейскай Стараны.

Пасьля рэвалюцыі, калі ўсе народы ў Расеі сталі зьбірацца на зьезды, на зборышчы і сталі радзіцца, аб свайго народу долі, сталі радзіцца, як наладзіць у сябе парадкі, каб жыць лепш, разумней,—стало ведама з газэт, што беларуская соцыялістычная грамада робіць зьезды і конфэрэнцыі, што ў Менску, у Піцяры, у Маскве беларускіе старые працаўнікі зазываюць беларусаў таксама на зьезды, на парады,—зазываюць гуртавацца ўсюды, каб агульнымі, каб злучэнымі сіламі дарадзіць сабе ў працы над адбудовай свайго краю, зруйнаванага вайной, каб справы свайго краю і свайго народу па волі самага народу наладжаліся і дасканаліліся, а сьвядомые беларусы, каб пакіравалі волей народнай на добрую дарогу. — Пачуўшы гэта, раскінутые па Расеі беларусы сталі задумляцца: а яны ад гэтага руху беларускага—ці ні пры чым маюць аставацца? І шмат дзе па Расеі паўсталі беларускіе гурткі, арганізацыі для палітычнай і культурнай працы на карысьць беларускага краю і народу. Да старых беларускіх гуртвоў у Піцяры і ў Менску пасыпаліся пісьмы с просьбай прыслаць беларускіх кніжак і адрасы

беларускіх газэт. Назаву тут некаторые дужэйшые арганізацыі і лепшых кіраўнікоў у іх. Апрача тых што былі ў Піцяры і Менску, паўсталі ў Маскве (Бурбіс, Дыла, Станілевіч, Васілевіч), у Магілёве (Кахановіч, Сэрбаў, Кожэмяка ды інш.), у Вітэбску (Мялешка), у Пскове (Хаценька), у Казапі (Янка Станкевіч і вучні Віленс. Х.-Т. школы) у Яраслаўлі (Ігнатоўскі, Сяўрук і студэнты Менс. Вуч. Інст.), у Арэнбургу (Лагутка), у Гэльсінгфорсу і Сьвеаборгу (—матросы), у Туле (Цьвікевіч), у Арле (Іваноўскі, Дубейкоўскі, Маркевіч), у Кіеві (Краскоўскі, Фарботка, Мядзёлка), у Бабруйску (Шантыр), у Слуцку (Астроўскі), у Адэсе (Нялепка), у Будславі (Вяночэк) і т. д. Нацыянальна-сьвядомая беларуская інтэлігенцыя і народ адразу сталі голасна дабівацца аўтаноміі і нават незалежнасьці. Цікаўна, як у гэты час пачала будзіцца і расьці беларуская нацыянальная і палітычная думка ў таей масы, між каторай толькі пачыналі даведывацца, што яны беларусы.

У войску на фронце і ў тылу, —найбольш пасьля таго, як украінцы выдзяліліся ў асобные ваенные часьці ды па вызаву Украінскай Рады ў Кіеві выправіліся ў свой край,— тады-як пасьля дажджу грыбы сталі гуртавацца ваенные беларусы, салдаты, ахвіцэры, чыноўнікі. Вясной 1917 году ў Піцяры быў ужо камітэт ваенных беларусаў. Зьбіраліся яны ў Беларускім Камітэце на Знаменскай № 36, 54. Дзіўна было, пазнаўшы ваенных беларусаў: яны ні с кім не гаварылі па беларуску, а толькі па казённаму, ды нават за аўтаномію Беларусі не стаялі. Доўга і не патрываў гэны камітэт: масквафільская палавіна адпала, каб „не стацца сэпаратыстамі“, і камітэт распаўся. Пад канец-жэ восені, пасьля таго, як паўсталі ўжо ваенные беларускіе Рады ўсіх фронтаў,—паўстаў у Піцяры новы Камітэт ваенных беларусаў.

Пачаўшые ў гэтым часе нацыянальна будзіцца беларусы сьперша для Беларусі зычылі найбольш „местнаго самоуправленія“, баючыся „отторженія отъ Россіи“.

Але пасьля большэвіцкага захвату ўласьці, калі ўсе народы сталі адсовывацца і ад большэвікоў і ад Расеі, аўтаномія Беларусі ўвайшла ў розум нават і беларускім масквафілам.

Затое старые беларускіе працаўнікі папоўненые вялікай масай новых сіл, каторые пасьпелі нацыянальна вырабіцца за час рэвалюцыі, старые грамадзяне Беларускай Сацыялістычнай Грамады стаялі і стаяць за незалежную вольную Беларусь.

Яшчэ ў восені 1916 году зьехаліся ў Піцяры некаторые старые працаўнікі беларускіе і нараджаліся, дзе-бы зьехацца беларусам большым лікам — усім беларускім працаўнікам для агульнай нарады: каб злучыць свае сілы для тае пільнейшае работы. якая будзе зьездам назначэна. Тады ўгаварыліся, што зьезд адбудзецца ў Кіеві, дзе Краскоўскі меў можнасьць скрыць зьезд ад паліцыі ў памяшчэньні саюза гарадоў. А пакуль што, каб азнаёміцца з беларускімі гурткамі ў Расеі, пасылалі дэлегатаў для перэгавораў з беларускімі працаўнікамі па Расеі. Выходзіўшые ў той час ў Піцяры беларускіе газэты „Дзяньніца“ і „Świetač“ пападалі шмат дзе па Расеі да беларусаў, умацовывалі дух беларускі.

У лістападзе 1916 году беларускі тэатр у Піцяры сабіраў поўна людзей! білеты прадавалі звыш нормы. На адным с спэктаклёў прыйшоўшага ў тэатр на беларускі вечар праф Карскага віталі асобнай прамовай.

У бурсе студэнцкай і вучнёўскай пры Беларускім бежанскім Камітэце бурсанты сталі выпускаць сваю газэтку рукапісную.

У каталіцкай сэмінарыі ў Піцяры клерыкі-беларусы завялі сваю беларускую бібліотэку. Аказалося там сьвядомых беларусаў-клерыкаў да 40 чэлавек.

Куцьцю, як тые гады так і ў 1916 году зрабілі складковую, цэлай грамадой-артысты, пісьменьнікі і дзеячы беларускіе.

Ваенная цэнзура не прапускала ў „Дзяньніцы“ і ў „Swietačy“ нічога патрыятычнага беларускага. У стацьці, дзе пісалося, што ад вайны страшэнна пацярпелі Бэльгія, Сэрбія, Беларусь... дык слова „Беларусь“ цэнзар перэкасаваў.

Э. Б.

У Вільні і ваколіцах.

× **Угодкі**. 6 ліпня мінуў год жыцьця Беларускай Народнай Страўні № 31 (сьв. Юрскі пр. 22), адкрытай Беларускім Камітэтам помачы пацярпеўшым ад вайны.

Число выдадзеных за год абедаў перайшло за 200.000. Цэна абедаў у пачатку была 10 фэн. за порцыю. Аднак, с прычыны падняцьця цэн за прадукты, яе прыйшлося двойчы павялічываць: сьперша да 14 фэн., а ў апошнім часе — да 20 фэн.

Пастаянных сталаўнікоў у страўні зарэгістровано 557.

× **Аб віленскім унівэрсытэце.** На заседаньні Каралеўска-Саксонскага Навуковага Таварыства ў Ліпску праф. Стіда прачытаў лекцыю аб гісторыі віленскага унівэрсытэту.

× **Аб выезьдзе ў Расею.** Тыдзень таму назад у Пскове расейскі ўрад спыніў прыём эміграптаў, пераезд каторых у Расею, наагул, сустрэчаецца з надта вялікімі прашкодамі. Нямецкіе ўласьці не кідаюць свае працы дзеля таго, каб дабіцца для жадаючых выехаць у Расею магчымасьці споўніць іх жаданьне.

× **Новы збор.** Stadthauptmann апавешчае, што ў будучыне будуць браць асобны збор за напаміманьне аб заплаце падаткаў, за арэшт на рэчы за незаплату падатку, за публікацыю аб прадажы гэткіх рэчаў з ліцытацыі і самую прадажу, за выдачу копій пратаколаў, за перэхоўваньне рэчаў, назначэных на ліцытацыю. Гэты збор—ад 20 фэн. да 60 марак, залежна ад сумы: ад 3 м. і звыш 5.000 м.

× **Найвышэйшые цэны.** Stadthauptmann апавешчае гэткіе найвышэйшые цэны:

1 кварта малака (3/4 літра) некіданага — 50 фэн. скіданага — 20 фэн., 1 фунт солі—29 фэн. за расейскі фунт, сахарына—65 фэн. за 100 таблетак, сахарына—2.75 м. за 500 таблетак, сахарына ў крышталах—1.60 м. за 5 грам., сахарына у крышталах—30.00 м. за картон у 100 гр. Скрыначка сернікоў—10 ф.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш.	найніж.
11—12	+ 25,[illegible]°	+ 15,6°
12—13	+ 24,2°	+ 15,0°
13—14	+ 25,7°	+ 10,1°
14—15	+ 2[illegible],7°	+ 14,5°

БІБЛІОГРАФІЯ.

Сяміязычны Слоўнік («*Sieben-Sprachen-Werterbuch — Deutsch-Polnisch-Russisch-Wöissruthenisch-Litauisch-Lettisch-Jiddisch. Herausgegeben im Auftrage des Oberhefehlshabers Ost. Leipzig*»).

Яно ведама, што рабіць культурную работу ў окупованым краю, ды яшчэ пад той час, як на ўсім цяперашнім ваенным фронці грымяць гарматы,—рэч ня лёгкая. І можна сказаць напярод, што работа, зробленая ў гэткіх варунках, ня можэ ўдацца, ня можэ здаволіць усіх вымогаў, якіе стаяць перад культурнай работай у нормальным часе.

Ужо прыступаючы да выданьня нямец.-польска-расейска беларуска-літоўск.-латышска-жыдоўскага слоўніка аўтары яго паказалі, што з беларускай мовай яны вельмі слаба знаёмы. Аб гэтым сьведчыць прадмова да слоўніка, у каторай аб беларускай часьці яго гаворыцца:

«Беларускі слоўнік меў асаблівые труднасьці. Гэта—вельмі старабытны, найстарэйшы с паміж славянскіх языкоў, ужываны цяпер бадай выключна селянамі і плытнікамі (?) і ў невялікай меры работнікамі ў фабрыках. У межах расейскага ўпраўленьня язык гэты ставаўся ўсё больш падобным да расейскага (?!) Цяпер беларусы стараюцца адрадзіцца і развіваюць багацьце свае мовы. Трэба было выбраць: якіе словы тварыць нанова, якіе браць з расейскага і польскага. Часта ўзьнімалося пытаньне: ці захоўваць тэхнічные выражэньні, якіе знаходзяцца ў ужытку, узятые з расейскага, як чужацкіе. Тут мо' была найвялікшая труднасьць работы. Мы маемо тут дзела з новымі языковымі творамі. Навукова на гэтым грунці блізка нічога не было зроблено (!!!). Мова мала дазнаная, і с прычыны падобнасьці яе да польскай і расейскай у ёй цяжка разьбірацца. Ня гледзячы на ўсе зробленые абмылкі, спроба гэга ўсёжтакі акажэ нейкую помач будучай навуковай працы».

Аб тым што мова беларуская зрабілася вельмі падобнай да расейскай пад маскоўскім панаваньнем,—для нас навіна. Праўда, што іншые беларусы, ашчасьліўленые казённай службай, папаўшые ў вураднікі, стражнікі, пісары ды агулам чыноўнікі ламалі свой язык на маскоўскі лад,—але жывая мова беларускай народнай масы блізка ўсюды, толькі за малымі выключэньнямі, асталася зусім чыстай. Ня можэм так-жэ згадзіцца і с тым, бытцым навукова на грунці беларускай філёлёгіі нічога не было дагэтуль зроблено: апрача Беларускага Слоўніка Носовіча і Слоўніка мовы старых актаў Гэрбачэўскага, аб каторых сяміязычны Слоўнік успамінае на канцы, мы знаем вялізарную трохтамовую працу аб беларускай мове акадэміка Карскага, чысьленые працы ў гэтым кірунку, друкаваные ў штогодніку пецярбурскай Акадэміі Навук, працы Фэдэроўскага, Кліха, Сержпутоўскага, вельмі багатые, многатомные зборнікі народнай літэратуры Рамапава, Шэй-

Францішк Олехновіч.

На Антокалі.

П'еса ў 3 актах са сьпевамі і танцамі.

(Гл. „Гоман“ № 54).

ІГНАТ (неахвотна).

А гэные...—ну добра, — зара прынясу.. (ідзе ў свой пакой і хутка варочаецца).

ВІНЦЭНТ.

Вось моцны гарэх!... Але гэтая газэта мяне палохае. Што яны напісалі!..

ІГНАТ.

(варочаецца і дае грошы Вінцэнтаму).

Вось...

ВІНЦЭНТ.

А дай Божэ табе здароўе, каханенькі!.. Пацалуй мяне і не кажы нічога Міхці... Але скажы-ж, калі ласка, што яны тут надрукавалі? Мо' ты тоішся з нечым? Кажы праўду! Будзь са мной як з родным бацькам.

ІГНАТ.

Пан Вінцэнты! Я тут ня ўсё разумею. Дзеля чаго ўсё гэта напісано — ня ведаю. Але рэч ня ў тым а вось у чым: калі ў газэце другі раз ужо аб тым самым друкуюць, калі Арон дае мне грамафон на павер і апрача таго хочэ мне яшчэ грошы пазычыць — дык мусіць усё гэта праўда!.. (Энэргічна, весела): Ах пан Вінцэнты! я чую, што памаладзеў!.. гатоў іісьці хоць у скокі! У-га! Пан Вінцэнты! паглядзеце пад сьвятло. Зарастае? (паказывае сваю лысіну).

ВІНЦЭНТ.

О! гушчар!..

ІГНАТ.

Я вам нічога дагэтуль не казаў... Я калісь купіў такую мазь і ёй кожны дзень шмарую лысіну. Праўда, што памагае?

ВІНЦЭНТ.

Пэўне; калі ёсьць такая мазь, дык і памагае... Але што лысіна! глупства! Самая глаўная рэч — грошы. Грошы — гэта грунт!

(пяе):

Калі грошы дае доля,
Хцівасьці тады больш ёсьць
Маеш крыху, хочэш болей, —
І ніколі табе досьць.

ІГНАТ (пяе):

Калі хто не мае грошы,
Ад яго усе проч бягуць.
Блісnуў людзём рублём ў вочы —
Усе каркі будуць гнуць.

ВІНЦЭНТ (пяе):

Мае рады хто паслухаў
Той ніколі не жалеў.
Не пушчай слоў міма вуха,
Я заўсёды розум меў,

ІГНАТ.

У галаве алей я маю,
Ведаю, што мне рабіць,
На чужой дудцы не граю,
Сам патраплю добра жыць.

(Абодва рады, здаволены, біруцца пад пахі і скачуць).

З'ява 3.

ТЫЕ-Ж МІХАЛІНА і ЗОСЬКА.

МІХАЛІНА.

(с кошыкам у руцэ).

А чаго-ж вы так цешыцеся?

ВІНЦЭНТ.

(падае ёй газэту).

Глядзі, Міхця! вось надрукавалі..

МІХАЛІНА.

А! аб Ігнаце?

ЗОСЬКА.

Мама! мама! пакажэце!

МІХАЛІНА.

(дае газэту Зосі).

Маеш. Як вярнуся, прачытаеш мне. Іду на рынак... Беда!.. дагэтуль не магу знайсьці сабе слугі!

ВІНЦЭНТ.

Бо ты ім, Міхця, надта задаеш дыхту, вось і ня хочуць у цябе служыць.

МІХАЛІНА.

А што-ж мне рабіць? па галоўцы гладзіць, — калі гультайка.

на і інш.—гэтые бязцэнные крыніцы для філёлёгаў. Зроблено многа, — і работа не спыняецца: цяпер, апрача раду людзей у межах старой окупацыі, над беларускім языком працуе праф. Р. Абіхт у Вроцлаве, малады беларускі філёлёг Тарашкевіч у Пецярбурзе, чысьленые беларускіе дзеячы ў Менску, у Магілёўшчыне (аўтар вялізарнага, дагэтуль, на жаль, нявыданага беларускага слоўніка, Ціхінскі) і т. д.

Мы разумеем, што варункі, у якіх адбылася праца над Сямізычным Слоўнікам, і кароткі тэрмін, дадзены для выпаўненьня яе, не далі магчымасьці даць рэч ідэальную. І тое, што ўдалося зрабіць скромнай беларускай работніцы, п. Ганне Душэўскай, жывучы ў Коўне, ёсьць ужо многа. Відаць і сумленнасьць у рабоці, толькі даволі ярка кідаецца ў вочы нестача матэр'ялаў. Дый каб выкарыстаць усе матэр'ялы, якіе ўжо ў нас ёсьць, трэба было-бы пасядзець над слоўнікам ня год і не два, а прынамсі гадоў пяць.

Што можна было даць пры такіх варунках—дадзено. У будучыне будзем ждаць лепшага слоўніка, але гэтага ня зробіш, гуляючы.

А.

З усяго Краю.

Будучыня нашых жыдоў.

Імперскі камісар для Балтыцкіх правінцый і Літвы, ф. Фалькенгаўзэн, 6 ліпня прыняў прэдстаўнікоў камітэту Усходу і заявіў ім паміж іншым:

«Мы здаем сабе справу аб вялікім значэньні пытаньня аб усходніх жыдох. Прынцыпіальна нямецкі ўрад аддае літоўскай дзержаве аканчацельнае ўладжэньне яе ўнутрэных спраў. Гэта не выключае, што мы выкарыстаем нашу павагу, каб былі здаволены справядлівые дамаганьні жыдоў. Пры аканчацельным ладжэньні спраў Усходу павінно быць цалком захована для ўсіх меншасьцей грамадзянскае роўнапраўства, права рэлігійнай свабоды, права захаваць свае асобеннасьці і свае традыцы. З гэтай прычыны і жыдоўскай нацыянальнасьці будзе дадзено права самабытнага ўстройства сваіх культурных спраў, — значыць, культурная аўтаномія. Апрыч таго жыды могуць спадзевацца і далей ідучых концэсій, як напр. у развязываньні сваіх спэцыяльна жыдоўскіх спраў. Нямецкі ўрад гэтак сама спагадае заходам аб унутрэны становы уклад жыдоўства, якіе выяўляецца ў жаданьні асесьці на ральлі».

Імперскі камісар высказаў у канцы надзею, што пры ўзаемным зразуменьні нацыянальнасьцей Літвы ім удасца загаіць учыненые вайной раны і павясьці багатую прыродным багацьцем старонку насустрэч шчасьлівай будучыне.

Падарожа Вальрафа.

Статс-сэкрэтар унутрэных спраў Вальраф, са сьвітай пачаў свой двохтыднёвы аб'езд Балтыцкіх зямель і Літвы.

Рэквізыцыя сёлетняга ўраджаю.

Начальнік Упраўленьня Літвы апавешчае паліцэйскі загад, паводлуг каторага ўвесь збор пладоў *на палёх* у гэтым 1918 годзі рэквізуецца Militär-Verwaltung am Litauen і гэтак выключаецца с свабоднага абароту. Да гэтага належыць жыта, пшаніца, ячмень, авёс, мешанка і ўсе млынавые прадукты з іх, асабліва атрубы і брага, а такжэ стручковые расьліны, грэчка, бульба, канюшына і расьліны, якіе даюць алей, буракі корм для скаціны і салома.

Ад імі Militär-Verwaltung Litauen гэтые прадукты скупляюць паветовые ўрады. Уселякая іншая купля і менка забаронены.

Кожын гаспадар павінен у належным часе сабраць плады і парупіцца аб зьберажэньні іх. Перадчасны збор і купля недасьпелых пладоў забаронены.

Нарушэньне гетага загаду і інструкцый паветовых начальнікаў у дадатку да яго вызываюць кару вастрогам да 2 гадоў або штрафам да 10.000 мар.

Палёгка ў падарожы па краю.

У найбліжэйшых днёх будзе зроблена палёгка ў падарожы па нашым краю. У опэрацыйных межах падарожа і надалей можэ адбывацца толькі с пазваленьня каманды арміі. Падарожа ў межах кожнага Verwaltung'а — Курляндыі, Litauen-Nord, Litauen Süd (Беласток-Горадня) — надалей пазваляецца маючым толькі пашпарт Об. Ост. Ехаць з аднаго Verwaltung'а ў другі, напр. з Litauen-Nord у Litauen-Süd (Беласток-Горадня) можна толькі маючым пазваленьне krejshaйptmanaй з месца выезду і з месца прыезду, якое трэба атрымаць перад выездам. Пераежджаючы зусім — на жыцьцё — трэба мець пазваленьне krejshauptmana месца, куды перэбіраюцца на жыцьцё, калі гэта ў тым самым Verwaltung'u, або начальніка Verwaltung'а, едучы ў чужы Verwaltung. Падарожа з Вільні і ў Вільню с прычыны небаспекі заразы вымагае яшчэ пазваленьня, значыць, Вільня становіць быццам асобны Verwaltung.

Начные пропускі пакідаюцца на далей на час ад 12 гадз. ночы да 5 гадз. раніцы ў зімовае паўгоду і ад 12 да 3 — у летняе. У рэшту часу людзі могуць свабодна хадзіць бяз пропускаў.

Чыгунка Мемэль-Шавлі.

Пачаліся падгатавіцельные работы дзеля будоўлі чыгункі Мэмэль Шавлі, каторая ажывіць паўночную часьць Ковеншчыны.

СЬВІСЛОЧ У пачатку жніўня адбудуцца выпускные экзаміны для вучняў чацьвёртага курсу Беларускай Вучыцельскай Сэмінарыі ў Сьвіслочы. Вучняў тамака цяпер 52.

15 жніўня пачынаецца пяты элемэнтарны курс, каторы будзе трываць гэтак сама 6 месяцаў. На вакансіі, каторых ужо асталося зусім мала, трэба запісывацца не пазьней 1 жніўня ў свайго Krejshauptmanna або Stadthauptmanna.

ГОРАДНЯ. Тут 25 ліпня зачыняюць 7 пекарняў.

У Горадні ўтварылася спэцыяльная арганізацыя дзеля апекі над жыдоўскімі ўпекачамі.

БЕЛАСТОК. Па загаду паліцыі не пазьней, як да 15 верасьня, усе коміны ў дамох дзеля забасьпечэньня ад пажараў павінны мець прылады дзеля непрапусканьня іскраў.

КРЫНІЧКІ. У начы с 6 на 7 ліпня тут укралі каштанавую кабылу.

БАЙКІ-СТАРАЯ ВЕСЬ. У аднага тутэйшага селяніна, пад той час, як ён быў ў падарожы, укралі кабылу 9 гадоў.

МАР'ЯМПОЛЬ. 15 жніўня тут адкрываецца 5-месячные вучыцельскіе курсы для маладых літвіноў.

ВІЛЬЯМПОЛЬ (пад Коўнай). У тутэйшай фабрыцы сернікоў у той аўторак у вечары ўзьняўся пажар. Дзякуючы энэргічнай рабоце ковенскай тушыльнай дружыны пажар удалося задзержаць на мейсцы ў фабрыцы каторая выгарэла.

АЛЕКСОТА. Тут украдзен раменны пояс. Двох работнікаў, каторые хацелі прадаць яго ў Коўне, арэштавалі.

ПЛАЗІЧНА. На работніка Станіслава Вэнгроўскага на дарозі напалі маладые хлопцы, каторые яго крэпка зьбілі і кінулі ў суседняе возера, — аднак, яму ўдалося выбрацца адтуль. Хлапцоў гэных арэштавалі.

ПАПЕМУНЬ. У тутэйшай малачарні ўкралі ў начы тры кадкі масла.

ТАЛЬСЭН. Што мы належым да заходу, можна бачыць хаця-бы с таго, што і ў нас, па прыкладу заходніх дзержаў, зьявілася гішпанская хвароба, на каторую хварэе перэважна цывільнае насяленьне. Латышы называюць яе «гішпанскай чумой, ад каторай ніхто не памірае».

КОЙДАНОУ, Менск. губ. Тут недаўна адбылося беларускае тэатральнае прэдстаўленьне. Былі пастаўлены на сцэне дзьве рэчы: «Ня розумам сьцяміў, а сэрцам» і «Па рэвізіі». Аркестр балалаечнікаў іграў беларускіе песьні.

СЛАБАДА КУЧЭНКА, Слуцк. пав. Тутэйшая моладзь, зразумеўшы сучаснае становішчэ Беларусі, злучылася ў гурток «Зарніца» з мэтай зрабіцца вольнымі ратаямі. Мае ён і культурна-прасьветные заданьні. З гэтага-ж і пачалася праца.

12 красавіка гурток уладзіў беларускі спэктакль. Ігралі «Па рэвізіі», камэдыю Крапіўніцкага. Ігра артыстаў была вельмі добрая, калі ўзяць пад увагу тое, што ўсе яны былі першы раз на сцэне, а некаторые дык сцэны дагэтуль і ў вочы не бачылі. Народу было многа, усе асталіся вельмі здаволены.

Гэтак у нас робіцца: старые былі прачнуліся, але ізноў заснулі, а маладые збудзіліся, злучыліся і працуюць.

Памажы ім, Божэ! («В. Б.»).

ДЗЬВІНСК Тайная палявая паліцыя выкрыла змову 14 асоб проці баспечнасьці арміі. У загаворшчыкаў знайшлі многа аружжа і ручных гранатаў. Ваенна-палявы суд засудзіў на растрэл Яна Тварановіча, Валадзімера Асташонка і Івэна Лацігевіча, каторые і растрэляны 8 ліпня. Дзесяць асоб засуджэны ў папраўчы дом, а адна апраўдана. Маршалак суда запратэставаў проці прыгавору аб 7 асобах і зажадаў новага разгляду справы. На судзе

ВІНЦЭНТ.

Дык мо' сягоньня пайсьці дзе колечы ў рэстаран на абед?

МІХАЛІНА.

Вось табе толькі ў галаве: рэстаран ды рэстаран!

ІГНАТ (бытцым да сябе).

Далібог ня ведаю: ісьці ці ня ісьці?

МІХАЛІНА.

Куды?

ІГНАТ.

Трэба пайсьці, — служба!

ВІНЦЭНТ.

Э, што служба!.. Кінь ужо нарэшце гэта! Сягоньня ж сьвята, — нядзеля.

МІХАЛІНА.

Ведама, што неварта... — Ну, а я ўжо пабягу, а ты Зоська, даглядзі самавару. (выходзіць праз глаўные дзьверы на вуліцу).

ЗОСЬКА

Добра.

З'ява 4.

ВІНЦЭНТ, ІГНАТ і ЗОСЬКА.

ІГНАТ.

А ўсё ж такі я пайду. Трэба быць акуратным.

ВІНЦЭНТ.

Ды кінь ты ўжо гэта!

ІГНАТ.

Не, яшчэ трэба пачэкаць. Як грошы буду мець вось тутака — ў руцэ — тады іншая справа.

ВІНЦЭНТ.

Дык грошы ўжо як у руцэ.

ІГНАТ (бярэ шапку).

Да пабачэньня!

ВІНЦЭНТ.

Не пачэкаеш гэрбаты?

ЗОСЬКА.

(выбегаючы да кухні).

Ужо зара будзе самавар!

З'ява 5.

ВІНЦЭНТ і ІГНАТ.

ІГНАТ.

Не, дзякую, ужо нема часу... — (Да Вінцэнтага): Панства будзеце ў хаці ўвесь дзэнь?

ВІНЦЭНТ.

Ня ведаю, як захочэ Міхця. А добра было-б паехаць кудысь за места на маёўку, у якісь шынок! Пагода пекная!.. А ты доўга там будзеш?

ІГНАТ.

Не; хутка вярнуся... Да пабачэньня! (выходзіць).

З'ява 6.

ВІНЦЭНТЫ (адзін).

Ну, дык трэба-ж мне падумаць аб сабе. Трэ' пагаліцца, бо барада як шчотка, а і варта-б зайсьці гдзэ колечы пасілкавацца, бо гэтая сэльцэрская вада можэ папсаваць жывот.. Жабы развядуцца ў трыбусе... (выходзіць).

З'ява 7.

ЗОСЬКА, пасьля ЮЗЮК.

ЗОСЬКА.

(уносіць шклянкі с кухні).

А!.. нікагусенькі нема! (клічэ): Пан Ігнат, пан Ігнат! (Паўза). Ці вы ўжо пайшлі? — Пан Юзюк! ці вы яшчэ сьпіцё?

ЮЗЮК.

(выходзіць с кута за хвіранкай).

Я ўсю ноч вачэй ня сплюшчыў.

ЗОСЬКА.

Вось як! Што-ж гэта вы: хворы? Я ня ведала... — Памажэце мне прынясьці с кухні самавар.

ЮЗЮК.

Добра.. (выходзяць у кухню. Хутка варочаюцца нясучы: ён самавар, каторы ставіць на стале, яна імбрык).

(Паўза).

ЗОСЬКА.

(налівае сабе гэрбаты, седае і п'е).

ЮЗЮК.

(седаючы пры варштаці).

Вось як!..

ЗОСЬКА.

Што: як?

ЮЗЮК (драматычна):

Усё скончылося!..

ЗОСЬКА.

Нішта не пачыналося!

(Далей будзе).

выявілося, што загаворшчыкі мелі супольнікаў на той бок гранічнае лініі.

Украіна.

КІЕЎ. Паводлуг усіх прыкмет ураджай на Украіне будзе вышэй сярэдняга, калі палажэньне пасеваў не пагоршыцца. Дзеля збору ўраджаю зроблены акуратные і абшырные крокі.

С Польшчы.

БЭРЛІН **Рэйхстаг.** Дэпутат Носкэ (соц.) апавешчае, што ў Варшаве і Лодзі расклеіваюцца праклямацыі с прызывам да жыдоўскіх пагромаў, і трэбуе абароны ад гэтага.

Памочнік статс-сэкрэтара, Левальд, кажэ, што гэные праклямацыі, ведама, вельмі скора зьдзіраюцца нямецкай паліцыей. Пры нячысьленасьці апошняе, магчыма, што ў некаторых сукромных мясцох гэткіе проклямацыі вісяць і далей.

ВестKі з Расеі.

ЖЭНЕВА. Паводлуг англіцкіх вестак, забойцы гр. Мірбаха арэштаваны.

МАСКВА. На пятым конгрэсе саветаў народны камісар Чычэрын паміж іншым заявіў:

„Адначасна с перэгаворамі аб эканамічных справах з Нямеччынай мы маемо наладзіць перэгаворы такжэ з Амэрыкай і Японіей. Ня гледзячы на ўсе нашы дамаганьні, францускі ўрад дагэтуль ня выпусьціў с Францыі расейскіх ваенных, каторых гвалтам прымушаюць запісывацца ў так-званы „расейскі легіон“. Адмовіўшыхся пастуціць туды высылаюць у Афрыку. Сібіру грозіць уваход чужаземцаў. Ужо 5 красавіка японцы занялі Владывасток. Мы гатовы адрачыся ад некаторых нашых правоў на ўсходня-кітайскую чыгунку і прадаць Японіі палудзенную часьць яе. Англія прызнала нашага пасла, Літвінова. Францыя дыплёматычных зносін з намі не паддзержывае. Англія, ня гледзячы на нашы пратэсты, высадзіла на Мурманскім узьбярэжжы 10.000 салдатаў. Значную моральную паддзержку ў Англіі аказываюць нам работніцкіе клясы, каторые ў гэты момэнт вядуць сільны грамадзянскі рух“.

ШТОКГОЛЬМ (В.Т.Б.). 8 ліпня конгрэс саветаў прыняў рэзалюцыю партыі комуністаў, згаджаючуюся цалком з усей унутрэнай і загранічнай палітыкай ураду і выказываючую цьвёрдую волю работнікаў і селян недапусьціць Расею да новае вайны. Рэзалюцыя прызывае ўсіх работнікаў і селян аднадушна паддзержываць савецкі ўрад.

Чычэрын сказаў газэтным карэспандэнтам, што новае вайны пачаць нельга, і савецкі ўрад адмаўляецца ад так-званай „японскай помачы“. „Прызнаньне ці непрызнаньне Японіей нашага ўраду для нас не мае вагі“.

МАСКВА (П.Т.А.). Чычэрын падаў прэдстаўніку Англіі ноту, трэбуючы зараз жэ ўзяць назад англіцкае войска з Мурманскага ўзьбярэжжа.

КОПЭНГАГА. Паслы саюзьнікаў у Расеі падалі расейскаму ўраду ноту з дамаганьнем доказаў урадовае заявы, быццам забойцы гр. Мірбаха наняты саюзьнікамі.

ШТОКГОЛЬМ. Адзін с кіраўнікоў соцыал рэвалюцыанераў, Гавровскій, заявіў прэдстаўнікам газэт:

«Наша партыя лічыць немінуючым умешаньне саюзьнікаў у ўнутрэные справы Расеі. Яна пастанавіла прыняць помач саюзьнікаў і ўсімі сіламі бароцца за аднаўленьні фронту і ачыстку Расеі ад немцаў»

Чэха славацкіе войскі, паводлуг газэтных вестак, занялі Казань. Сазваные Троцкім па Урале рэкруты быццам прылучыліся да іх.

ПАРЫЖ. Ізвольскі і Маклаков арганізавалі расейска-ўсходня-азіяцкі камітэт, каторы вядзе агітацыю, каб саюзьнікі ўмешаліся ў расейскіе справы.

З усяго сьвету.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). **Главная Камісія Рэйхстагу.** Граф Гэртлінг у сваей прамове сказаў паміж іншым:

„Выхад у адстаўку статс-сэкрэтара Кюльмана і замена яго другой асобай не азначае зьмены палітычнага курсу. Тое, што я абяцаўся ў унутрэнай палітыцы, будзе споўнено. Што датычэцца загранічнай палітыкі, дык ворагі, ня гледзячы на ўсе нашы мірные заявы, далей выступаюць з заявамі, якіе вызываюць на твару кожнага немца чырвень ад гневу. Пакуль будзе істнаваць заданьне зьнішчыць нас, мы павінны далей бароцца Калі-ж у ворагаў зьявіцца ўрэшці сур'ёзнае—я падчырківаю гэтае слова, „сур'ёзнае“—жаданьне міра, дык мы гэные сур'ёзные—я яшчэ раз паўтараю гэтае слова—прэдлажэньні разглядзім с поўнай уважлівасьцю. Аднак дыплёматы варожых дзержаў дагэтуль аб такой магчымасьці не гаварылі. Гэта мой пагляд. І гэтага дзержыцца такжэ вышэйшая ваенная каманда.

„Мы стаём на грунце Берасьцэйскага міра і хочэм сумленна выпаўніць яго ўмовы. На жаль, гасударственнае палажэньне ў Расеі яшчэ вельмі няцьвёрдае. Мы бязспорна верым жаданьням расейскага ўраду, але ня можэм безумоўна верыць у яго здольнасьць споўніць узятые на сябе абязацельствы. Гэта пацьверджае і страшэннае ліхадзейства ў Маскве, якое, паводлуг усіх данных, учынено с прычыны намовы саюзьнікаў. Мы хочэмо жыць у згодзі з расейскім урадам, але павінны дзержаць расчыненымі нашы вушы і вочы на прыпадак магчымага перэвароту тамтэйшых устаноў.

„Гэтак, панове, я яшчэ раз кажу, што мы будзем дзержацца ў нашай палітыцэ курсу, прызнанага большасьцю Рэйхстагу ў лістападзе леташняга году“.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Султан паслаў нямецкаму імператару тэлеграму, адзначываючы сваю цьвёрдую волю паддзержываць саюз Турцыі с цэнтральнымі дзержавамі і поруч з імі вясьці вайну далей—да пабеднага канца.

РОТТЭРДАМ. Галава англіцкіх прафэсыональных саюзаў, Сьмілі, на конгрэсе прафэсыональных саюзаў заявіў, што работніцкая партыя на новых выбарах выставіць да 400 кандыдатаў. Блізка той час, калі работніцкая партыя здабудзе перэвагу ў парляманці.

БЭРН (В.Т.Б.). У адрэсе ірляндзкай лігі да прэзыдэнта Вільсона, між іншым, гаворыцца:

«За 750 гадоў англіцкае няволі ірляндзкі народ не бачыў ніводнага вялікадушнага акту англіцкага панаваньня. Еднасьць з Англіей дала Ірляндыі цяжкіе падаткі, скалечэнную прамышленасць масовую эміграцыю і нягодных чыноўнікаў. З гэтым абвінавачэньнем мы выступаем проці Англіі перад усім сьветам“.

Тэлеграмы.

Нямецкіе апавешчэньні.

12.VII. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага: Артылерыйская чыннасьць у вечары ўзмацавалася і ў начы дайшла значнай сілы. На поўдня ад Іпра, а такжэ пры Байель і на поўначы ад Альбэр адкінуты сільные наступленьні ворагаў.

Фронт нямецкага Насьледніка: Між Эн і Марн—ажыўленая чыннасьць французаў. У лесі Віле-Котрэ і на ўсходзі ад Рэймсу мы ўзялі палонных.

З амэрыканскіх самалётаў, атакаваўшых Кэльн, аб чым была гутарка ўчора, мы зьбілі і апошні самалёт.

13.VII. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага: Пры Байель адкінуты сільные англіцкіе наступленьні. У бітвах між Кастэль і Майі французам удалося заўладаць Кастэль і хутарам Аншэн.

Фронт нямецкага Насьледніка: Між Уаз і Марн — ажыўленая баевая чыннасьць. Наступленьні ворагаў на поўначы ад Лёнг-Пон і на паўдня ад Урк адбіты.

Фронт Альбрэхта Вюртэмбэрскага: У Эльзасе баевая чыннасьць узмацавалася.

У чэрвені на нямецкіх фронтах зьбіты 468 варожых самалётаў і 62 прывязные лятучые шары. 217 самалётаў зьбіты за нашым фронтам. Мы ўтрацілі 153 самалёты і 51 прывязны лятучы шар.

14.VII. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага: На заходнім беразі Авр ажывілася чыннасьць артылерыі.

Фронт нямецкага Насьледніка: Бітвы ў лесі Віле-Котрэ. Пасьля сільнай артылерыйскай падгатоўкі ворагі атакавалі на заходзі ад Шато Т'еры, але былі крывава адбіты.

Нашы лятучые эскадры атакавалі жалезнадарожные будоўлі на францускім узьбярэжжы між Дюнкірхэм і Абвіль, у ваколіцах Ліль, у С. Поль, Дулян, Крэпі-ан-Валюа і Віле-Котрэ.

Каля вайны.

БЭРЛІН. Рэйхстаг прыняў ува ўсіх трох чытаньнях новые ваенные крэдыты на 15 мільярдаў проці галасоў незалежных соцыалістаў. Палякі ўстрымаліся ад галасаваньня.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Аб будучыне Бэльгіі імперскі канцлер у сваей прамове ў Рэйхстагу заявіў, што Нямеччына не зьбіраецца ўдзержаць Бэльгію пад сабой. Мэта Нямеччыны—гэта захаваньне цэласьці яе граніц, свабода эканамічнага разьвіцьця і патрэбные завераньні проці небаспекі ў будучыні. Ужо цяпер, само сабой, нельга падробна сказаць аб долі Бэльгіі: гэта залежыць ад будучых перэгавораў.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). У канalі Ляманш нашы падводные лодкі ізноў затапілі 4 параходы ёмкасьцю 20 тысяч тонн. У паўночных водах—15 500 тонн.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Нашы падводные лодкі навакол Англіі затапілі ізноў 16 500 тонн.

У Большэвізіі.

Як паедзе наш Менчук
Гандлеваць ў Расею,
У кішэні ёмкі пук
Грошы ў дабрадзея.

Выглядае с твару ён
Сыты і прыгожы.
Голас зычны, проста звон,
Проста ангел Божы!

На ім вопраткі бліпчаць,
Залаты загарак.
А камашы зіхацяць.
Шапка—ў дзесяць марак.

А як вернецца Менчук
З большэвіцкіх раяў,
На граніцы—стук і стук!
«Таварыш» спаткае.

Той агледзіць з усіх бакоў
Кемна і гвалтоўна.
Іскры сыплюцца з вачоў—
Тому ўсё роўна.

Ой, астаўся без грашэй,
Згінуў і пакунак.
Клічыць, бедны, ўсіх людзей
Громка на ратунак.

На спатканьне бачыць ён
Йдзець „краснагвардзеец“.
Новы плач і новы стогн:
—Ох, ты, ліхадзеец!

—Дзе загарак? дзе пальто?
Рвуць ад ног бацінкі.
„Сабатажнік“! То-ж -ба-то.
Ішчэ строюць кпінкі.

Падымаюць кулакі
Рыцары сваволі.
Аж напухлі твар, бакі...
Наш Менчук ужо голы.

І вертаецца назад
Бедны чуць з душою.
Па ім відна, што не рад,—
Выбіўся са строю!

(Б. Ш.) *Я—р.*

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Садавей.